# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА А. І. ЛІПЦІ



**Андрэй Лепцін, кіраўнік падпольнай групы,**
**разам з жонкай Феадосіяй  і старэйшым сынам Пятром**
Крыніца фотаздымка: Віцебскі абласны краязнаўчы музей на сайце https://smolbattle.ru/

**Перыяд дзеяння:**

красавік 1942 г. – верасень 1943 г.

**Месца дзеяння:**

пральня па вуліцы Леніна ў г. Віцебску

**Колькасць:**

невядома

**Кіраўнікі:**

Андрэй Лепцін («Ліпці»)

Дзейнічала з красавіка 1942 г. да верасня 1943 г. у пральні, якая абслугоўвала вайсковыя часці акупантаў. Кіраўнік А. І. Ліпці, у доме якога (па вуліцы 12-й Гарадоцкай, д. 20/10) была канспіратыўная кватэра. У складзе групы: С. Сюдаболь, В. Чу Чалін, З. Шаракова (Матвіевіч) і інш.

Па квітках на бялізну падпольшчыкі вызначалі нумары вайсковых часцей, месцы іх дыслакацыі, прыблізную колькасць, час прыбыцця і выбыцця часці з пэўнага ўчастка фронту. Патрыёты перапальвалі хімікатамі вялікія партыі бялізны, здабывалі для партызан зброю і бензін (толькі за адзін раз партызанам адпраўлена 17 каністраў бензіну). Група мела сувязь з партызанскім атрадам М. Ф. Біруліна праз К. Д. Балдачову. З прыбыццём В. З. Харужай яны разам з З. Шараковай былі яе сувязнымі. З лета 1942 г. група Ліпці выконвала заданні армейскай разведгрупы П. А. Крылатых. Сувязнымі былі сёстры Ірына і Міра Жан Ванфу, якія перадавалі шыфроўкі Харужай і адказнаму арганізатару Віцебскага падпольнага абкама КП(б)Б па горадзе В. Р. Кудзінаву.

У верасні 1943 г. гітлераўцы арыштавалі Ліпці, Чу Чаліна і Сюдаболя. У турме іх штодзённа збівалі. Сюдаболь, які дрэнна гаварыў па-руску і, як падалося акупантам, быў мала прыдатным для падпольных спраў, таму яго адправілі ў канцлагер, адкуль падпольшчыку пашчасціла ўцячы. А. І. Ліпці і В. Чу Чалін былі расстраляны.

**ЛІТАРАТУРА**


1. **В Витебске** во время Великой Отечественной войны действовала китайская подпольная группа. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/gruppa-lip-ti.html. – Дата доступа: 01.12.2021.

2. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група А. І. Ліпці / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 490.

3. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Ліпці А. І. / Н. І. Дарафеенка, М. У. Дарафеенка // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1990. – С. 131.

4. **Подпольная** группа Липти А. И. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 289–290.